УДК 947.0857(476)

БЯПУ+9(с3)+ 9с2

*М. М. Забаўскі*

# Аграрнае пытанне ў Расійскай Дзяржаўнай думе III склікання і пазіцыі дэпутатаў ад Беларусі

Дзяржаўная дума ў Расіі (1906-1917 гг.) — прадстаўнічая аканадаўчая ўстанова. Створана царызмам ва ўмовах рэвалюцыі 905-1907 гг. з мэтай папярэдзіць новы рэвалюцыйны выбух і ырашыць галоўныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця раіны: аграрнае, нацыянальнае, рабочае і іншыя, захоўваючы епахіснымі асновы самадзяржаўнага ладу. У Расійскай імперыі дзяржаўная дума склікалася чатыры разы: I скліканне — 27.4-7.1906 г.; II — 20.2-2.6.1907 г.; III — 1.11.1907-9.6.1912 гг.; / –15. 11.1912-6.10.1917 гг.

Мэта дадзенага артыкула: прааналізаваць пазіцыі дэпутатаў і Беларусі па аграрнаму пытанню ў III Думе. У беларускай старыяграфіі гэта тэма разглядалася ў працах М. В. Біча [1] і . М. Забаўскага [2].

Як адзначалася, 1 лістапада 1907 г. у Пецярбургу пачала аю работу Дзяржаўная Дума III склікання. Па свайму класава- / складу і палітычнаму абліччу яна цалкам адпавядала інтарэ- м самадзяржаўя. З 442 дэпутатаў налічвалася: 178 (43%) два- н, 191 (43,5%) памешчык-землеўладальнік, 36 (7,5%) прамыс- ўцаў і гандляроў, 44 (10%) святары і місіянеры, 984 (19,5%) тэлігенты, 66 (15%) сялян-земляробаў, 11 (2,3%) рабочых і меснікаў [3].

У III Думу былі абраны 292 прадстаўнікі трудавых партый, ліку якіх 144[1] [1] чарнасоценцы і 148 акцябрыстаў. Лібералы ымалі 108 месцаў (прагрэсісты — 28, кадэты — 54, польскае а — 11, польска-літоўска-беларуская група — 7, мусуль- нская — 8. Сацыял-дэмакраты правялі ў Думу 19 і трудавая упа 14, усяго 33 дэпутаты [4].

Ні адна з думскіх фракцый, як і прадугледжвалася законам 3 чэрвеня 1907 г., не валодала большасцю месцаў у Думе, а ала дзве большасці: чарнасоценна-акцябрысцкую і акцяб- сцка-кадэцкую. Першая ствааралася, калі акцябрысты, якія

---

[1] Чарнасоценцы ў Думе падзяляліся на тры фракцыі: правых (49 дэ- таў), памяркоўна-правых (69 дэпутатаў) і нацыяналістаў (26 дэпута- . Памяркоўна-правыя і нацыяналісты ў студзені 1910 г. былі аб'яднаны . Сталыпіным у Рускую нацыянальную фракцыю (лідэры І. А. Бабрын- В. В. Шульгін).

выконвалі ролю думскага "цэнтра", галасавалі разам з чарнасоцепцамі (148+144 — 292 галасы), другая, калі акцябрысты стварaлі блокі з лібераламі (118+108 — 226 галасоў).

Такое становішча было выгадным для ўрада, таму што дазваляла лавіраваць паміж памешчыкамі і буржуазіяй, у чым праяўлялася палітыка думскага банапартызму. Праваакцябрысцкая большасць была заклікана праводзіць у Думе законапраекты, накіраваныя на барацьбу з рэвалюцыяй, а акцябрысцка-кадэцка-сталыпінская — законапалажэнні, накіраваныя на "вырашэнне" асноўных пытанняў грамадска-палітычнага жыцця (законапраекта паводле ўказа ад 9 лістапада, земства, народнай адукацыі і г. д.).

Нацыянальны склад думы: велікарусаў — 338 (77%), украінцаў — 28 (6%), беларусаў — 18 (4,3%), палякаў — 18 (4,3%), немцаў — 12 (2,3%), армян, башкіраў, татар — па 4, яўрэяў, эстонцаў, малдаван, грэкаў — па 2 [3].

19 дэпутатаў ад заходніх губерняў увайшлі ў фракцыю думскіх правых. Сяляне К. І. Ярмольчык, А. Ф. Кучынскі, А. М. Налівайка, А. І. Юркевіч (Мінская губ.), У. Л. Гаўрылюк, І. В. Вайцюлік (Гродзенская губ.), П. Ц. Шаўцоў (Магілёўская губ.) аднеслі сябе да памяркоўна-правых (у пачатку 1910 г. увайшлі ў Рускую нацыянальную фракцыю, акрамя П. Ц. Шаўцова), 4 дэпутаты ад Беларусі далучыліся да думскіх акцябрыстаў (у іх ліку адзін правы акцябрыст), 1 — да мірнаабнаўленцаў, 6 дэпутатаў-палякаў стварылі ў Думе польска-літоўска-беларускую групу. У левым лагеры з 36 дэпутатаў ад 5 заходніх губерняў не было прадстаўнікоў. У трэцядумскі перыяд цэнтральнае месца ў аграрнай палітыцы ўрада папярэдняму займаў указ ад 9 лістапада 1906 г. З яго выхадам значна актывізавалася дзейнасць Сялянскага пазямельнага банка з мэтай падтрымкі заможных гаспадарак. Асобае значэнне надавалася дзейнасці банка ў заходніх губернях, дзе галоўнай задачай было насаджэнне рускіх памешчыкаў і сялян за кошт скарачэння польскага дваранскага землеўладання. Гэта палітыка знайшла шырокую падтрымку з боку чарнасоценнага беларускага кулацтва, інтарэсы якога выражала, у прыватнасці, таварыства "Крестьянин". У аграрным пытанні яно ставіла мэтай "...дабівацца такіх умоў, пры якіх "беларускаму сялянству" аблягчалася б магчымасць пашыраць межы сваёй зямельнай дробнай уласнасці, а польскі элемент не меў бы магчымасці ўтрымаць буйную зямельную ўласнасць у сваіх руках" [5].

Адным з істотных недахопаў урадавага ўказа таварыства "Крестьянин" лічыла ўтрыманне асноўнай часткі зямлі памешчыкамі-палякамі. Менавіта таму яно прапанавала ўстанавіць норму на памешчыцкую зямлю ў памерах 300-400 дзесяцін, а астатнюю прадаць сялянам. Такім шляхам кулацтва разлічвала

пашырыць свае зямельныя ўладанні за кошт памешчыкаў-палякаў. Наогул, часопіс "Крестьянин" заклікаў земляробаў давяраць указу ад 9 лістапада, спадзявацца, што ў Думе ён яшчэ "...будзе падвергнуты некаторым зменам, якія істотна палепшаць становішча сялян [6].

15 лістапада 1907 г. урад унёс прапанову абраць зямельную камісію ў складзе 66 чалавек для падрыхтоўкі праекта паводле ўказа ад 9 лістапада і прадстаўлення яго ў Думу. Сацыял-дэмакраты і трудавікі ў сваіх выступленнях патрабавалі, каб зямельная камісія прыступіла да распрацоўкі "законапраекта аб прымусовым адчужэнні прыватнаўласніцкіх зямель без выкупу, аб надзяленні зямлёй малазямельных і беззямельных сялян" [7]. Але чарнасоценна-акцябрысцкая Дума не стала разглядаць гэты праект і звяла аграрнае пытанне толькі да абмеркавання ўказа ад 9 лістапада 1906 г. Дэпутаты маглі праявіць свае адносіны да гэтага важнейшага пытання грамадска-палітычнага жыцця Расіі толькі пры яго абмеркаванні. 23 кастрычніка 1908 г. указ быў унесены на разгляд у Думу.

Ад фракцыі правых дэпутатаў Думы сваю думку наконт указа выказаў епіскап Гомельскі Мітрафан, цалкам падтрымаўшы яго. Ён прызнаў абшчыну адвечнай і зручнай для "кіраўнікоў і настаўнікаў народа" з'явай у тым сэнсе, што яна дае магчымасць "развіць свой асветніцкі ўплыў на народ". Але паколькі ў "апошні час гэта перавага выкарыстана людзьмі, якія выцясняюць "настаўнікаў" народа і імкнуцца сеяць смуту...прывіваць сялянам пачуцці нянавісці, зайздрасці, помсты" [8, сл. 199], то епіскап выступіў за ліквідацыю абшчыны. Перавагу пераходу да прыватнага сялянскага землеўладання прамоўца абгрунтаваў тым, што ўласнік-селянін палюбіць сваё і "навучыцца шанаваць чужое" [8, сл. 200]. Выражаючы пункт погляду правых па гэтаму пытанню, адзін з іх лідэраў заявіў: "Усяляк садзейнічаць выхаду з абшчыны там, дзе да гэтага прасочвасцца імкненне з боку некаторых асоб ці цэлых таварыстваў" [8, сл. 204].

Протаіерэй У. І. Нікановіч (Віцебская губ.) выказваў надзею, што ўказ ад 9 лістапада вырашыць зямельнае пытанне, "і гэта, — адзначаў прамоўца, —спрыяльна адаб'ецца на пытанні аб нашых царкоўных землях, нават і ў сэнсе знішчэння шкоднай цераспалосіцы" [8, сл. 1534].

Велікарускі нацыяналіст В. К. Тычынін (Гродзенская губ.) прапанаваў прыступіць да асваення новых зямель у Заходняй Сібіры, Туркестане, Закаўказзі і заявіў, што гэтыя непрадукцыйныя землі з'яўляюцца запасным фондам для забеспячэння зямельнай патрэбы [9]. Акрамя таго, ён лічыў, што ўрад пры ўдзеле і садзейнічанні мясцовых грамадскіх устаноў і прыватных таварыстваў павінен заняцца акультураваннем няўдобіц (балоціс-

тых, пясчаных, накрытых ярамі), якія будуць садзейнічаць вырашэнню аграрнага пытання. У выступленні У. К. Тычыніна і ў іншых прамовах правых дэпутатаў заўважалася імкненне адцягнуць сялян ад асноўнага пытання – ліквідацыі памешчыцкага землеўладаппя і завастрыць увагу на другарадных момантах.

Выступленні правых дэпутатаў ад Беларусі – епіскапа Мітрафана, протаіерэя Ф. І. Нікановіча, В. К. Тычыніна нічым не адрозніваліся ад агульных пазіцый, якія займалі прадстаўнікі галоўных манархічных партый у Расіі. Іх сутнасць зводзілася да таго, што ўказ ад 9 лістапада 1906 г. з'яўляецца адзіным сродкам вырашэння аграрнага пытання і выратавання ад рэвалюцыі.

Рэакцыйны друк Беларусі, у прыватнасці газеты "Минское слово", "Могилёвский вестник" і інш., сістэматычна друкавалі выступленні ў Думе правых дэпутатаў ад заходніх губерняў пакопт указа. Вітаючы ўрадавыя меры, "Могилёвский вестник" пісаў: "Да правільнага вырашэння аграрнага пытання адзіны прамы шлях, які ўжо абраны ўрадам, г.зн. перасяленне сялян на вольныя землі, пераход сялян да хутарскіх гаспадарак, набыццё імі зямлі з дапамогай Сялянскага банка" [10].

Адносіны акцябрыстаў да названага ўказа фактычна не адрозніваліся ад пазіцый крайне правых. Акцябрысты лічылі, што ўказ адкрые шлях да ўздыму сельскай гаспадаркі, а адпаведна, да пашырэння ўнутранага рынку, развіцця гандлю і г. д. Яны разумелі, што ліквідацыя абшчыннага землеўладання і продаж надзельнай зямлі пацягнуць за сабой пралетарызацыю сялянства, павялічаць колькасць дадатковых рабочых рук. Таму члены "Саюза 17 кастрычніка" актыўна выступалі ў абарону сталыпінскай ініцыятывы. Акцябрыст І. Я. Паўловіч (Мінская губ.) заўважыў недахопы ўказа толькі ў "рэдакцыйных хібах" [9, сл. 955].

Прыхільнікамі ліквідацыі абшчыннага землеўладання былі 4 члены польска-літоўска-беларускай групы (прадстаўнікі палякаў-землеўладальнікаў ад беларуска-літоўскіх губерняў). Буйны памешчык С. А. Ванькові (Віленская губ.) заявіў: "Мы, безумоўна, з'яўляемся прыхільнікамі галоўных асноў і палажэнпяў указа ад 9 лістапада. Грамадскі лад, які абапіраецца па асабістую ўласнасць, з'яўляецца галоўным рухавіком грамадскага прагрэсу, адпаведна закон, які дае магчымасць сялянскаму насельніцтву набываць права асабістай уласнасці, з'яўляецца важным крокам па шляху да яго"[9, сл. 1224]. Выступленне С. А. Ваньковіча сведчыла аб адсутнасці рознагалоссяў паміж "рускімі" і польскімі землеўладальнікамі заходніх губерняў адносна ўказа ад 9 лістапада.

Да правых і акцябрыстаў далучыліся і прагрэсісты. Адзіным

іх прадстаўніком ад заходніх губерняў у III Думе быў В. А. Біч (Гродзенская губ.). Падтрымліваючы агульнапалітычную платформу прагрэсістаў, ён некалькі адступаў ад пазіцый гэтай партыі па аграрнаму пытанню, імкнуўся выражаць интарэсы мясцовых беларускіх сялян, выхадцам з якіх ён быў. В. А. Біч склаў табліцу, якая адлюстроўвала размеркаванне зямельных участкаў паміж сем'ямі сялян у Брэсцкім павеце Гродзенскай губерні. Выкарыстоўваючы свае падлікі, аўтар паказаў, што ўрадавыя меры не змогуць палепшыць становішча сялянства, "таму што яны не валодаюць нават мінімумам зямлі, неабходным для вядзення гаспадаркі". В. А. Біч прапанаваў рэарганізаваць усё мясцовае кіраванне Паўночна-заходняга края: ліквідаваць становішча "узмоцненай аховы" (у тых паветах, дзе яно было ўведзена), увесці земскае самакіраванне з "дастатковымі паўнамоцтвамі ў гаспадарчай і культурнай галінах" [9, сл. 258-259]. Дэпутат заявіў: "Сродкі, якія асігнуюцца земствам з дзяржаўнага казначэйства на паляпшэнне сельскай гаспадаркі, толькі пры такіх умовах і пры яднанні ўрада з мясцовымі сельскагаспадарчымі таварыствамі маглі б прынесці дапамогу для ўздыму сельскай гаспадаркі" [10, сл. 259-260]. Такім чынам, В. А. Біч выражаў інтарэсы заможнай часткі беларускага праваслаўнага сялянства, якое выступала за ўвядзенне земства ў заходніх губернях.

Прынцыповых пярэчанняў супраць указа не было і ў кадэтаў. Лідэры партыі П. М. Мілюкоў, А. І. Шынгароў, А. Е. Беразоўскі толькі перасцерагалі ўрад ад паспешнасці ў справе разбурэння абшчыннага землеўладання. У прыватнасці, А. І. Шынгароў абвяшчаў: "Я лічу, што насаджэнне прыватнай уласнасці настолькі каштоўны скарб, што надзвычай рызыкоўна падвяргаць яго няўмелым эксперыментам..." [8, сл. 262]. Кадэты асцерагаліся пралетарызацыі часткі насельніцтва вёскі, узмацнення класавай барацьбы і пратэставалі супраць крутых адміністрацыйных захадаў П. А. Сталыпіна. А. Е. Беразоўскі заклікаў урад не ўцягвацца ў зямельныя справы сялян, "...не ўводзіць ніякіх штучных ферментаў для паскарэння працэсу разлажэння абшчыны" [9, сл. 397].

У II Думе кадэты прапанавалі адхіліць указ ад 9 лістапада 1906 года [11, с. 151] — вылучылі свой праект закону выхаду з абшчыны. Устанаўленне 3-гадовага тэрміну выхаду з абшчыны дазваляла запаволіць тэмпы разбурэння абшчыннага землеўладання. Пазіцыя "асцярожнасці" была прадыктавана страхам перад рэвалюцыяй. Кадэцкія прамоўцы сканцэнтравалі асноўную ўвагу на "крытыцы" ўказа.

У думскіх спрэчках выступілі 5 сялянскіх дэпутатаў ад Беларусі: В. А. Амасёнак, М. К. Ермалаеў (Віцебская губ.), А. Ф. Кучынскі і А. І. Юркевіч (Мінская губ.), П. Ц. Шаўцоў

(Магілёўская губ.). Усе дэпутаты-сяляне (за выключэннем Шаўцова) абаранялі сталыпінскі ўказ, а дакладней, — пункт погляду па ўказ заможных сялян, г. зн. выступалі за разбурэнне абшчыннага землеўладання, выдзяленне зямлі ў прыватную ўласнасць, але дабіваліся зніжэння працэнтаў па пазыках Сялянскага банка.

Апалагічны пункт погляду выказаў М. К. Ермалаеў, які пераконваў дэпутатаў у тым, што "не трэба баяцца з'яўлення сялянскіх памешчыкаў, дзякуючы ўказу, а імкненне стаць заможным, — заяўляў дэпутат, — мы павінны толькі вітаць". Але небяспека перад рэвалюцыйнай вёскай вымусіла М. К. Ермалаева крытыкаваць указ, які, на яго думку, "нічым не дапаможа беззямельным, малазямельным сялянам" [8, сл. 851]. Такога ж меркавання прытрымліваўся валасны суддзя А. І. Юркевіч [9, сл. 991]. Праваслаўны кулак Кучынскі лічыў указ "асновай таго парадку, які можа палепшыць становішча сялянства". Яго больш хвалявалі высокія працэнты Сялянскага банка, якія ён прасіў панізіць і выражаў незадаво额 тым, што рознымі падаткамі абкладаліся толькі сяляне, якія набылі зямлю з дапамогай банка [8, сл. 1363-1366].

Іншую пазіцыю займаў П. Ц. Шаўцоў. Дэпутат пачаў з таго, што пакіраваўшыя яго ў Думу сяляне "зусім не жадалі ад Дзяржаўнай думы ўказа ад 9 лістапада..., ён нічога не ўносіць..., яны чакалі іншых крыніц надзялення сялян зямлёй..., указ не патрэбны". П. Ц. Шаўцоў заключыў: "Без надзялення малазямельных і беззямельных сялян зямлёй немагчыма дасягнуць мірнага стану" [8, сл. 1267]. На жаль, адсутнічаюць звесткі аб памерах гаспадаркі гэтага прадстаўніка сялян Магілёўшчыны. Але выступленні сведчаць, што ён не адносіўся да заможных, а ў Думе быў адзіным дэпутатам ад заходніх губерняў, які ў пэйкай меры выражаў інтарэсы працоўных мас вёскі.

Пры абмеркаванні аграрнага пытання ў III Думе актыўнасць праявілі сяляне-трудавікі. Як і ў першых Думах, яны выказаліся за нацыяналізацыю [8, сл. 1202] усёй зямлі. Дэпутат Дзюбінскі (Табольская губ.) абвясціў: "...зямля павінна быць грамадскім набыткам, належаць усяму народу, і кожны павінен мець права на зямлю" [8, сл. 1202].

У Дзяржаўную Думу не трапілі прадстаўнікі працоўнага сялянства Беларусі. Ні адзін з дэпутатаў ад 5 заходніх губерняў не падтрымаў трудавікоў.

Сацыял-дэмакратычная фракцыя III Думы ўключала 19 дэпутатаў. Большасць яе членаў належала да меншавікоў. Бальшавіцкіх пазіцый прытрымліваліся 9 дэпутатаў. Наконт указа ад сацыял-дэмакратычнай фракцыі паспелі выступіць толькі Гагечкоры (Кутаіская губ.) і Белавусаў (Іркуцкая губ.) да абмежавання часу прамоўцаў. Пратэстуючы супраць

“насілля”, якое праявілася ў гэтым абмежаванні, астатпія адмовіліся выступаць. Бславусаў намаляваў карціну эканамічных адносін у вёсцы і паказаў, што крыніцай аграрнай барацьбы з'яўляецца, з аднаго боку, супрацьпастаўленне паміж інтарэсамі шматмільённага сялянства, і невялікай колькасці памешчыкаў — з другога. У заключэппе Беласусаў зазначыў: “Мы далёкія ад жадання пераконваць вас, настойваць адмовіцца ад указа ад 9 лістапада, у вашых руках зараз улада і сіла..., сіла дыктуе законы, стварае права, і, каб заваяваць права, неабходна сабраць сілы і арганізаваць іх” [8, сл. 577-594]. Гагечкоры ўказаў на адзіны шлях разрашэння аграрнага пытання: “пераход зямлі сярэдніх і буйных землеўладальнікаў, а таксама зямель дзяржаўных, удзельных і манастырскіх сялян” [8, сл. 323].

Такім чынам, меншавікі не абаранялі ў Думе сваю праграму муніцыпалізацыі зямлі, прынятую на IV з'ездзе РСДРП [12], а вылучалі патрабаванні: канфіскацыю ўсіх царкоўных, манастырскіх удзельных, дзяржаўных і памешчыцкіх зямель; стварэнне сялянскіх камітэтаў для распараджэння канфіскаванымі землямі да ўстанаўлення ўсенародным устаноўчым сходам новага зямельнага ўпарадкавання. Гэта тлумачылася тым, што меншавікі баяліся аддаліцца ад працоўнага сялянства і думскіх сялян-трудавікоў, якія ва ўсіх трох Думах выказваліся за нацыяналізацыю зямлі.

8 мая 1909 г. праект закону згодна ўказа ад 9 лістапада 1906 г. быў прыняты праваакцябрысцкай большасцю III Дзяржаўнай думы. На жаль, у стэнаграфічных справаздачах адсутнічаюць вынікі балаціроўкі, і немагчыма ўстанавіць, за якія фракцыі галасавалі дэпутаты ад заходніх губерняў. Затым законапраект паступіў на разгляд у Дзяржаўны Савет, дзе быў таксама прыняты і пасля зацвярджэння царом стаў законам ад 14 ліпеня 1910 года.

Спрэчкі паводле указа ад 9 лістапада ў Думе мелі вялікае палітычнае значэнне. Яны прадэманстравалі сялянскім масам сутнасць пазіцый урадавых партый, лібералаў і сацыял-дэмакратаў па важнейшаму пытанню грамадска-палітычнага жыцця краіны.

У заходніх губернях, у адрозненне ад цэнтра Расіі, хутарызацыя пачалася яшчэ да канчатковага зацвярджэння ўказа ў III Думе. Да пачатку 1909 г. абшчыннае землеўладанне існавала толькі ў Магілёўскай (дзе яно складала 79,2%) і Віцебскай (44,6%) губернях. Менавіта ў гэтых губернях мясцовыя ўлады прыклалі максімум намаганпяў для ліквідацыі абшчыны. Так, Магілёўскі губернатар барон Нолькен у лістападзе 1909 г.

выступіў з прамовай перад земскімі начальнікамі[1], у якой патрабаваў накіраваць усе намаганні для хутчэйшага правядзення ў жыццё новага ўказа. З такой жа прамовай губернатар выступіў у г. Быхаве, дзе абавязаў земскіх начальнікаў паспяхова правесці ўказ, меўшага, па яго словах, "акрамя розных станоўчых бакоў і вялікае эканамічнае значэнне" [13]. У пачатку 1909 г. губернатар Нолькен з такой жа мэтай наведаў г. Шклоў [14].

У надтрымку сталыпінскага аграрнага курса была разгорнута шырокая прапагандысцкая кампанія. Яго віталі і падтрымлівалі газеты "Новое время" [15], "Минское слово" [16], "Северо-Западная жизнь" [17], часопіс "Крестьянин" і іншыя чарнасоценныя выданні. Толькі ў 1906 г. на імя галоўнага кіраўніка землеўпарадкавання і земляробства князя Васільчыкава было адлічана 100 000 рублёў на выданне кніг, брашур і г. д., тлумачыўшых сутнасць распараджэнняў урада [11, с. 185].

Праваслаўнае беларускае кулацтва, падтрымліваемае ўрадам і мясцовымі ўладамі, пры актыўнай дапамозе чарнасоценных дэпутатаў Думы імкнулася прыстасаваць указ ад 9 лістапада да сваіх інтарэсаў. У снежні 1908 – студзені 1909 гг. у Вільні па ініцыятыве таварыства "Крестьянин" і "Белорусского общества" адбыўся з'езд "прадстаўнікоў вёскі" Паўночпа-Заходняга края. Ідэйныя натхняльнікі кулацкага "форума" дэпутаты III Дзяржаўнай думы Г. Г. Замыслоўскі, І. П. Сазановіч, В. К. Тычынін, І. Я. Паўловіч, Сапуноў, А. С. Вяраксін [18] распавядалі аб прывілеях урадавага ўказа і адзначылі нізкі працэнт пераходу ад абшчыннай формы землеўладання да хутарнай у Віленскай і Гродзенскай губернях у параўнанні з іншымі заходнімі губерпямі. Прамоўцы патрабавалі ад мясцовых улад і прысутных дэпутатаў "больш інтэнсіўнай рэалізацыі рэформы".

З мэтай папулярызацыі ўказа ад 9 лістапада сярод сялянства ўрад заахвочваў будаўніцтва паказальных хутароў, правядзенне іншых паказальных мерапрыемстваў. Улічваючы гэта, кулакі Селяніны (бацька і сын) прапанавалі прысутным чарнасоценным настаўнікам народных школ пры кожным вучылішчы наладжваць паказальныя палі. Г. Г. Замыслоўскі ад імя правых дэпутатаў Думы ўскладаў вялікія надзеі на мясцовае "истинно-русское" сялянства, якое зможа паскорыць працэс перасялепня па хутары.

Перад закрыццём з'езда была абвешчана тэлеграма

---

[1] Земскія начальнікі, якія прызначаліся Міністэрствам унутраных спраў (МУС) у асноўным з рускіх праваслаўных дваран, былі галоўнымі фігурамі сталыпінскіх аграрных мерапрыемстваў. З 1908 г. пры МУС былі заснаваны спецыяльныя курсы "для падрыхтоўкі асоб, жадаючых прайсці іспыты на пасаду земскага начальніка".

П. А. Сталыпіна, накіраваная з'езду, а Г. Г. Замыслоўскі ўручыў старшыні таварыства "Крестьянин" С. Кавалюку 1000 рублёў, асігнаваных на падтрымку часопіса "Крестьянин" [19].

Супраць чарнасоценных памешчыцкіх і кулацкіх "истинно-русских" і "истинно-польских" партый і арганізацый вяла барацьбу газета "Наша ніва". У трэцячэрвеньскі перыяд на старонках газеты ўзмацнілася прапаганда хутарызацыі (папулярызацыя паказальных хутароў, дакладныя парады сялянам: што неабходна мець для перасялення на хутар, як на новым месцы будаваць жыллё, весці гаспадарку і г. д.), якой у лютым 1909 г. быў прысвечаны двайны (6-7) нумар. Але хутарызацыя, прапагандуемая газетай, зусім не атаясамлівалася са сталыпінскай аграрнай рэформай: П. А. Сталыпін разглядаў сваю рэформу як апошні сродак, а лідэры "Нашай нівы" як частковую меру вырашэння аграрнага пытання "мірным шляхам"[20].

З 1912 г. "Наша ніва" адыходзіць ад прапаганды фальваркавых хутарскіх гаспадарак. У № 2 за 1913 г., разважаючы аб сродках паляпшэння эканамічнага становішча працоўнай вёскі, газета рэкамендавала сканцэнтраваць намаганні на развіцці навыкаў сумеснай працы розных кааперацый, з мэтай чаго выступіла ініцыятарам арганізацыі сельскагаспадарчых таварystваў, развіцця хатніх рамёстваў і г. д.

"Кожны крок на гэтым шляху будзе набліжаць нас да таго часу, калі народ, які пазнае свае патрэбы і навучыцца сваімі сіламі задавальняць іх, урэшце возьме ўсе справы ў свае рукі" [21], – пісала газета. Больш таго, у № 28 за 1914 г. "Наша ніва" прызнала, што становішча малазямельнага сялянства нельга палепшыць хутарызацыяй [22], якую вызначыла бесперспектыўнай. У цэлым пасля трэцячэрвеньскага дзяржаўнага перавароту кіраўнікі "Нашай нівы" па аграрнаму пытанню займалі ліберальна-народніцкія пазіцыі.

Гвалтоўная рэалізацыя ўказа ад 9 лістапада (закону ад 14 чэрвеня 1910 г.) абвастрыла супярэчнасці ў вёсцы паміж сялянствам і памешчыкамі, з аднаго боку, паміж сельскагаспадарчымі рабочымі і вясковай беднатой і капіталістычнымі прадпрымальнікамі – з другога. Часопіс марксісцкай накіраванасці "Просвещение" пісаў, што ўказ ад 9 лістапада, стаўшы законам, "аддаваў шматмільённую сялянскую масу на рабаванне "моцных", міраедам і памешчыкам ..., падзяляючы вёску на два лагеры і ўмацоўваючы ў ёй пачаткі буржуазнага развіцця" [23].

Серадцякі, асабліва бедната, аднесліся да ўказа варожа. Так, у сяле Вялікія Лукі Навагрудскага павета сяляне забаранілі каморнікам землеўпарадкаваных камісій праводзіць работы на раздзелу абшчынных зямель. У сяло прыбылі прыстаў з ураднікамі і стражнікамі. У выніку 16 сялян былі арыштаваны і накіраваны ў Навагрудскую турму [24]. З Чэрыкаўскага павета

Магілёўскай губерні паведамлялі, што "само жыццё вёскі патрабуе змянення форм землеўладання, але абшчыннікі моцна трымаюцца за прадзедаўскія запаветы" [25]. Частымі з'явамі сталі канфлікты паміж кулакамі, хутаранамі і сялянамі-абшчыннікамі.

З Быхаўскага павета ў газету "Северо-западная жизнь" паведамлялі: "Сенажаці хутаран былі вытраўлены, а засеяныя хлебам палі вытаптаны жывёлай. Паміж хутаранамі і абшчыннікамі часта адбываліся спрэчкі, пакуль адна не перарасла ў крывавую драму [26]. Сяляне былі незадаволены тым, што кулакі захоплівалі лепшыя абшчынныя землі. Барацьба супраць аграрных мерапрыемстваў урада не спынялася і ў Мінскай губерні. Газета "Правда" паведамляла, што 24 красавіка 1912 г. сяляне Бродніцкай воласці Пінскага павета "аказалі супраціўленне прыбыўшай паліцыі. Іры гэтым адзін з сялян быў забіты, пяцёра паранены..." [27].

Калі ў 1907 г. у цэлым па Расіі колькасць сялянскіх выступленняў супраць указа ад 9 лістапада складала 4% у агульным патоку пытанняў аграрнага руху, то ў 1910 г. – 41%. Большасць падпалаў кулацкіх гаспадарак за гэты час павялічылася да 42 %. У гэты перыяд у Беларусі колькасць сялянскіх выступленняў узрасла ў 1,8, а колькасць падпалаў кулацкай маёмасці – у 2 разы [28].

Такім чынам, у гады першай расійскай рэвалюцыі ўрад і памешчыкі прынялі шэраг захадаў, каб спыніць барацьбу сялян за зямлю. Галоўнай мерай быў сталыпінскі ўказ ад 9 лістапада 1906 г., які прадугледжваў раздачу абшчынных зямель кулакам, не закранаючы асноў памешчыцкага землеўладання. Заможная частка беларускай вёскі, інтарэсы якой выражалі таварыства "Крестьянин" і "Белорусское общество" і іх прадстаўнікі ў Думе, віталі ўрадавыя меры і патрабавалі абмежаваць колькасць зямлі, сканцэнтраванай у руках польскіх памешчыкаў з тым, каб пашырыць свае зямельныя надзелы за іх кошт.

У Дзяржаўнай думе і на месцах партыі ўрадавага лагера падтрымалі ўказ. Да правых і акцябрыстаў прымыкалі прагрэсісты. Адзіны прагрэсіст ад заходніх губерняў В. А. Біч сцвярджаў, што развіццё хутароў будзе стрымлівацца малазямельным сялянствам, адсутнасцю ў яго асабістага капіталу, неабходнай культуры. Прынцыповых пярэчанняў супраць указа не было і ў кадэтаў. Яны, у прыватнасці, выступалі толькі супраць паскарэння тэмпаў разбурэння абшчыны. Сялянскія дэпутаты ад Беларусі, прымаўшыя ўдзел у спрэчках па аграрнаму пытанню, за выключэннем Шаўцова, патрабавалі выдзялення зямлі ў асабістую ўласнасць, г. зн. падтрымлівалі сталыпінскі ўказ, але дабіваліся паніжэння працэнтаў па пазыках Сялянскага пазямельнага банка. Дэпутат Шаўцоў (Магілёўская губ.) быў

адзіным з прадстаўнікоў ад 5 заходніх губерняў, які заяўляў, што ўказ ад 9 лістапада не вырашыць зямельнага пытання. У гэтым плане ён фактычна падтрымліваў трудавікоў. Як і ў першых Думах, трудавікі выступалі за нацыяналізацыю ўсёй зямлі. Гвалтоўнае правядзенне рэформы сустрэла супраціўленне з боку сярэдняга сялянства і беднаты. З ліквідацыяй надзельнай зямлі як асобнага віду сялянскага землеўладання непарыўна была звязана і ліквідацыя сялянства, а разам з ім і той асновы, на якую абапіраўся самадзяржаўны лад Расіі, што ўрэшце было адной з прычын катастрофы 1917 г.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. Мн., 1994. С. 401-440.
2. *Забаўскі М. М.* Дзяржаўная дума // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. Мн., 1996. С. 240-243; *Яго ж.* Аграрный вопрос в общественно-политическом движении в Беларуси в период III Государственной думы (1907-1912 гг.) // Сельское хозяйство и крестьянство беларуси: Материалы науч. конф. 27-29 окт. 1989 г. Мн., 1991.
3. *Аврех А. Я.* Третьеиюньская монархия и образование третьедумского помещичье-буржуазного блока // Вестник Московского университета. Сер. ист.-филол. 1956. С. 60.
4. *Кирьянов И. К., Лукьянов М. Н.* Парламент самодержавной России. Государственная дума и её депутаты. 1906-1907. Пермь, 1995. С. 86-87.
5. Северо-западный голос. 1908. 9 янв.
6. Крестьянин. 1906. № 24.
7. Государственная дума: Стенографические отчеты. Созыв III. Сессия 1. Ч. 1. Стб.:256, 259, 260.
8. Тамсама. Сессия 2. Ч. 1.
9. Тамсама. Ч. 3.
10. Могилёвский вестник. 1907. 27 нояб.
11. *Дубровский С. М.* Столыпинская земельная реформа. М., 1963.
12. КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. М., 1983. Т. 1. С. 194.
13. Могилёвский вестник. 1908. 11 нояб.
14. Северо-западный голос. 1909. 4 нояб.
15. Новое время. 1908. 20 окт., 6 нояб.
16. Минское слово. 1909. 1 янв.
17. Северо-западная жизнь. 1911. 17 дек., 2 нояб.
18. Минское слово. 1909. 1 янв.
19. Минское слово. 1909. 4 янв.
20. Наша ніва. 1912. 16 лют.
21. Наша ніва. 1913. 10 студз.

22. Біч М. В. "Наша ніва" // БелСЭ. Т. 7. Мн. 1973. С. 462.
23. Просвещение. СПб. 1912. № 5. С. 24.
24. Белорусская жизнь. 1911. 27 мая.
25. Белорусская жизнь. 1911. 13 июля.
26. Северо-западиая жизнь. 1911. 22 сент.
27. Правда. 1912. 25 апр.
28. *Липинский Л. П.* Столыпиская аграрная реформа в Белоруссии. Мн., 1978. С. 220.

## *Summary*

*This article examines the views of governmental, liberal, national, social-democratic forces towards the Government Decree from November 9, 1906 during the III Duma period (1907-1912).*

УДК 947.081(476)

*А. П. Жытко*

# Да пытання аб "разборы" шляхты на Беларусі ў XIX ст.

Юрыдычныя акты Расійскай імперыі XIX ст. амаль у кожным томе "Поўнага збору законаў..." ці "Зводу законаў..." утрымліваюць артыкулы, адрасаваныя шляхце заходніх губерняў. Чым жа была выклікана пільнасць улад да гэтай сацыяльнай групы? Каб адказаць на пастаўленае пытанне, коратка ахарактарызуем дадзеную групу насельніцтва, разгледзім, якую ролю яна адыграла ў развіцці края.

Шляхта ў Польшчы, а затым у Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ) адносілася да вышэйшага саслоўя. Непасрэдна ў Польшчы яна з'явілася ў XIII-XIV ст. У ВКЛ XIII-XVI ст. асноўная маса феадалаў лічылася баярамі, якія былі названы шляхтай у Гарадзельскім прывілеі 1413 г. Пасля Люблінскай уніі 1569 г. шляхта ВКЛ злілася са шляхтай Польшчы. На канфедэрацыйным сейме 1696 г. шляхта ВКЛ была канчаткова ўраўнавана ў правах з польскай шляхтай. У Рэчы Паспалітай шляхта была вызвалена ад дзяржаўных павіннасцяў (акрамя вайсковай службы і невялікага зямельнага падатку), ад юрысдыкцыі каралеўскіх суддзяў. Яна атрымала правы займаць дзяржаўныя пасады, асабістай і маёмаснай недатыкальнасці, удзельнічала праз сеймы ў прыняцці законаў і вырашэнні пытанняў аб вайне і міры, у выбранні караля і інш. Па сутнасці, з канца XVI ст. шляхта панавала ў краіне. Рэч Паспалітая пры слабасці каралеўскай улады фактычна з'яўлялася шляхецкай рэспублікай. Права